**Андрэй Мяцельскі**
(Мінск)

## Пачаткі Нясвіжа

Нясвіж — родавае гняздо князёў Радзівілаў даўно прыцягвае ўвагу гісторыкаў. Аднак іх цікавасць да Нясвіжа носіць даволі аднабокі накірунак. Гісторыкаў цікавяць альбо яго помнікі архітэктуры, альбо гісторыя рода князёў Радзівілаў. У той жа час, шматлікія іншыя пытанні гісторыі самога горада застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў. І адно з такіх недаследаванных пытанняў — лакалізацыя ў прасторы і часе той першапачатковай кропкі адкуль пачаў сваё развіццё горад.

З якога боку мы б не ўязджалі ў Нясвіж нас усюды сустракае памятны знак, што горад упершыню згадваецца ў летапісах у 1223 г. Сапраўды, у той далёкі год аб'яднаныя сілы ўсходнеславянскіх княстваў упершыню сустрэліся ў бітве на рацэ Калка з мангола-татарамі. Летапіс паведамляе, што ў гэтай бітве разам з іншымі князямі татары забілі „(...) Святослава Шумьскаго, Мстислав Чернеговського с сыном, Юрья Несвежьского (...)", апошняга з якіх, пачынаючы з XIX ст. атаясамляюць з уладаром сучаснага Нясвіжа і, адпаведна, дату першага летапіснага згадвання сучаснага горада адносяць да 1223 г. Гэтая дата даволі трывала прыжылася ў гістарычнай літаратуры, хаця згодна са „Спісам рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх" канца XIV в. „Шумьскыи и Несвежьскыи" гарады размяшчаліся на тэрыторыі Уладзіміра-Суздальскай зямлі.

Акрамя таго, у ВКЛ у XIV-XVI стст. існаваў род князёў Несвіцкіх (Несвічскіх), якія мелі цэнтр сваіх уладанняў у г. Несвічы, размешчаным у сучасным Луцкім раёне Валынскай вобласці Украіны. Аднак, гэты княжацкі род, маючы ў сваіх уладаннях Збараж, з часам паклаў пачатак княжацкага роду Збаражскіх[1], якія да нашага Нясвіжа ніякага дачынення не маюць.

Такім чынам, атаясамленне летапіснага „Юрыя несвежъского" з гісторыяй сучаснага Нясвіжа не мае пад сабой ніякіх падстаў. Згаданы князь Юры ў 1223 г. валодаў нейкім іншым Нясвіжам, лакалізацыя якога пакуль канчаткова не вызначана.

Калі ж цікавы для нас Нясвіж упершыню з'яўляецца на старонках пісьмовых крыніц? Сёння самая ранняя дата згадвання Нясвіжа адносіцца да 1446 г., калі вялікі князь Казімір Ягелончык даў яго Мікалаю Неміровічу: „От великого князя Казимира королевича ко всим людем несвижаном, што Селявко держал. Дали есмо Несвижо паноу Мико-

[1] J. Wolff, *Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku*, Warszawa 1895, s. 606.

лаю Немировичоу со всим потому ж, как Селявко держал, и Вы бы его были послушни (...)”[2].

Кім быў той Сяляўка, што трымаў Нясвіж да перадачы яго Мікалаю Немiровiчу доўгі час было незразумелым. Пісьмовыя крыніцы нічога не паведамляюць пра Сяляўку акрамя гэтай адзінай згадкі. Аднак знаёмства з самой крыніцай паказала[3], што сёння мы карыстаемся недакладным варыянтам яе перадачы. На самой справе ў крыніцы напісана: „От великого князя Казимира королевича ко всим людем несвижаном, што **Клавко** держал. Дали есмо Несвижо паноу Миколаю Немировичоу со всим потому ж, как **Клавко** держал, и Вы бы его были послушни (...)”.

Калі Сяляўка для гісторыкаў быў невядомай постаццю, то адносна Клаўкі і яго роду паведамленні ў крыніцах, хаця і сціпла, але сустракаюцца на працягу ўсяго XV ст. і пачынаюцца яны сярод дакладна недатаваных запісаў пра зямельныя наданні караля Казіміра.

Так, у першай палове XV ст. адзначаецца, што вялікі князь Казімір у наваколлях Клецка, даў „Клавку десеть чоловекъ, тых же половина, што за Вяжевичомъ”. Удакладненне, што Казімір на момант надання Клаўкі людзьмі быў яшчэ толькі вялікім князем, дазваляе датаваць гэтае паведамленне перыядам паміж 1440-1447 гг. Далей гэтая ж крыніца ўдакладняе, што ад вялікага князя Івашка Вяжэвіч атрымаў „10 человек на Морочи и съ ловища, до воли великого князя, при пане Петраши”[4]. Улічваючы, што Івашка Вяжэвіч у сярэдзіне XV ст. займаў пасаду маршалка гаспадарскага[5], а Клаўка валодаў людзьмі разам з ім, нельга выключыць, што Клаўка быў ягоным служылым баярынам.

Геаграфічна гэтая крыніца і згаданая ў ім рака Морач уводзяць нас у сучасныя Слуцкі, Капыльскі і Салігорскі раёны Мінскай вобласці, дзе яна працякае. Такім чынам, Клаўка ў сярэдзіне XV ст., акрамя Нясвіжа, валодаў якімісьці землямі і людзьмі на рацэ Морач.

Сярод зямельных наданняў вялікага князя Казіміра (1440-1447 гг.) згадваецца і сын Клаўкі, Сямён, у якога былі забраны два чалавекі ў Говенсе[6], у якой пазнаецца больш позняя Гавезна, сучасная в. Вішнявец Стаўбцоўскага раёна, размешчаная ў 12 км ад Нясвіжа. Такім чынам атрымліваецца, што род Клаўкі ў першай палове XV ст. валодаў земля-

[2] J. Jakubowski, *Czy istnieli kniaziowie nieświescy?*, „Ateneum Wileńskie”, 1923, nr 1, s. 2.

[3] Новае чытанне дакумента, што захоўваецца ў Галоўным архіве даўніх актаў — AGAD, зрабіў к. г. н. А. Б. Доўнар.

[4] *Литовская Метрика. Книга записей № 3 (1440-1498)*, Вильнюс 1998, с. 56.

[5] L. Korczak, *Litewska rada wielkoksiążęca w XV wieku*, Kraków 1997, s. 101-102.

[6] *Русская историческая библиотека* (далей: *РИБ*), т. 27, Санкт-Петербург 1910, с. 89.

мі ў наваколлях Нясвіжа, але па нейкіх прычынах менавіта ў гэты час пачаў іх губляць. Што потым стала з родам Клаўкі, дакладна невядома. Яшчэ ў канцы XVI ст. згадваецца гаспадарскі баярын Андрушка Клаўкавіч, які валодаў землямі ў Віленскім павеце[7] і які, магчыма, меў адносіны да былых уладальнікаў Нясвіжа, але потым род Клаўкі губляецца ў гісторыі.

Трэба сказаць, што ў гэтым жа комплексе зямельных наданняў вялікага князя Казіміра згадваецца, што нейкі Ганус атрымаў нейкае сяло каля Свержаня[8]. Нельга выключыць, што да ўладанняў гэтага Гануса адносілася і сучасная в. Ганусаўшчына, размешчаная на поўнач ад Нясвіжа.

Першае згадванне (1446 г.) Нясвіжа ў пісьмовай крыніцы сведчыць пра тое, што гэты населены пункт у сярэдзіне XV ст. ужо існаваў. Аднак адразу ўзнікае другое пытанне ў гісторыі Нясвіжа: дзе ён размяшчаўся? Бо праводжаныя ў горадзе археалагічныя даследаванні не выявілі тут матэрыялаў раней сярэдзіны XVI ст.[9], а пісьмовая крыніца ўводзіць нас, як мінімум, у першую палову XV ст. Куды, калі абапірацца выключна на археалагічныя крыніцы, прапала цэлае стагоддзе ў гісторыі горада і чаму назіраецца нестыкоўка паміж пісьмовымі і археалагічнымі крыніцамі, што асвятляюць гісторыю Нясвіжа і што з сябе ўяўляў Нясвіж у XV ст.?

Верагодна, у першай палове XV ст. гэта быў яшчэ толькі феадальны двор, цэнтр воласці, якой да 1446 г. валодаў Клаўка, а ў гэты год вялікі князь перадаў яе Мікалаю Неміровічу. Што яшчэ вядома пра Нясвіж сярэдзіны — другой паловы XV ст.? Захаваліся толькі сціслыя звесткі пра тое, што ў 1471 г. Мікалай Неміровіч пабудаваў тут касцёл[10].

Пра тое, што Нясвіж сярэдзіны — другой паловы XV ст. быў яшчэ толькі феадальным дваром сведчыць пісьмовая крыніца канца 70-х — 80-х гг. XV ст., якая згадвае яго сярод уладанняў маршалка дворнага і слонімскага намесніка Солтана Аляксандровіча. „Двор Нясвіж”[11] — так крыніца характарызуе сацыяльны статус цікавага нам паселішча

[7] *РИБ*, т. 27, с. 758.

[8] Там жа, с. 93.

[9] Л. Чарняўская, І. Чарняўскі, *Нясвіж. З мінулага*, „Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”, 1988, № 1, с. 21-24; А. К. Краўцэвіч, *Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV-XVIII стст. Планіроўка, культурны слой*, Мінск 1991, с. 41-42, 103-104; Д. А. Коваленко, *Планировка и застройка средневековых Несвижа и Копыси*, [у:] *Матэрыялы па археалогіі Беларусі*, 2005, вып. 9, с. 57-63; Ён жа, *Историко-топографическое развитие городов Радзивиллов: Копыси и Несвижа*, [у:] *Матэрыялы па археалогіі Беларусі*, 2005, вып. 9, с. 64-69.

[10] J. Ochmański, *Biskupstwo wileńskie w średniowieczu. Ustrój i uposażenie*, Poznań 1972, s. 66.

[11] П. Н. Жукович, *Неизданное русское сказание о Жировичской иконе Божьей Матери (в связи с историей русского дворянского рода Солтанов Жировичских)*,

ў канцы XV ст. Тым не менш, мяркуючы па „Реестры пана Солтана”, гэта быў двор плацежаздольнай воласці, прадукцыя з якой вывозілася ў Свержань, адкуль пачыналася суднаходства па Нёмане[12].

Як доўга Солтаны валодалі Нясвіжам невядома, але ўжо 10 лістапада 1492 г. новаабраны вялікі князь Аляксандр дае яго маршалку земскаму, троцкаму ваяводу Пятру Янавічу Мантыгірдавічу. У гэтай жа крыніцы зноў пацвярджаецца сацыяльны статус Нясвіжа як двара. Аднак зараз ён выступае ў якасці адміністрацыйнага цэнтра — да яго прылягае больш дробная воласць „Чучевичи”, размешчаная на Палессі і „дворец” Крутой Бераг — сучасная аднайменная вёска Нясвіжскага раёна, размешчаная на рацэ Уша[13].

На пачатку XVI ст. (1502 г.) Нясвіж згадваецца ў хроніцы Быхаўца ў сувязі з набегам татараў: „Татарове ж пошли в загоны в землю и шедши воевали около Клецка и Несвижа и зажгли город Клецк (...)”[14]. Клецк тут названы горадам, а адносна сацыяльнага статуса Нясвіжа нічога не паведамляецца і, верагодна, ён яшчэ заставаўся дваром, цэнтрам воласці. Як цэнтр воласці Нясвіж выступае і ў грамаце 1509 г., у якой гаворыцца каго і куды кароль адправіў перапісваць землі[15].

Такім чынам, шэраг пісьмовых крыніц сярэдзіны XV — пачатку XVI стст. сведчыць пра тое, што Нясвіж у гэты час ужо існуе, аднак яго сацыяльны статус на той час не адпавядаў статусу горада і, хутчэй за ўсё, гэта было яшчэ адносна невялікае паселішча — звычайны феадальны замак, альбо, як яго называе крыніца, двор, цэнтр невялікай сельскай воласці.

Якія памеры мела воласць Нясвіжа і дзе мог знаходзіцца яе цэнтр у XV — пачатку XVI стст.? Некаторыя пісьмовыя, археалагічныя і іншыя крыніцы дазваляюць нам прыкладна акрэсліць рэгіён дзе размяшчалася гэтая воласць і дзе трэба шукаць яе цэнтр.

На поўдзень ад сучаснага Нясвіжа, у 17 км ад яго знаходзіцца Клецк, які з XII ст. вядомы як горад, меў адпаведную свайму статусу сельскую акругу, таму на поўдзень воласць Нясвіжа не магла распаўсюджвацца далёка ад сучаснага аднайменнага горада.

Як адзначалася вышэй, у другой палове XV ст. Нясвіжам і яго воласцю валодалі Солтаны. Верагодна, частка іх уладанняў знаходзілася ва ўсходняй частцы сучаснага Нясвіжскага раёна.

[у:] *Известия отделения русского языка и словесности Императорской академии наук*, т. 17, кн. 2, Санкт-Петербург 1912, с. 194; *РИБ*, т. 20, Москва 1903, стб. 871-876.

12 *РИБ*, т. 20, стб. 875-876.

13 J. Jakubowski, *Czy istnieli kniaziowie nieświescy?..*, s. 4.

14 *Полное собрание русских летописей*, т. 32, Москва 1975, с. 169.

15 *Литовская метрика. Книга записей № 8 (1499-1514)*, Вильнюс 1995, с. 315, № 422.

Прыкладна ў 10 км на ўсход ад сучаснага горада мы і зараз сустракаем характэрны тапонім — вёску Салтанаўшчыну, якая ўваходзіла ў склад уладанняў Солтанаў і вядзе сваю гісторыю як мінімум з канца XV ст. У Солтанаў жа ў другой палове XVI ст. князем Мікалаем Крыштафам Радзівілам Сіроткай былі выкуплены і іншыя населеныя пункты, размешчаныя ў гэтым рэгіёне — двор Затур'я і вёскі Бузуны, Плесавічы і Ракавічы[16]. Магчыма, гэтыя вёскі існавалі ўжо ў XV ст. і таксама знаходзіліся ва ўладаннях Солтанаў, што дазваляе іх разглядаць у якасці састаўной часткі воласці Нясвіжа XV — пачатку XVI стст. На захад ад сучаснага горада, як адзначалася вышэй, межы воласці Нясвіжа дасягалі сучаснай вёскі Круты Бераг. Такім чынам, цэнтр Нясвіжскай воласці XV ст. павінен знаходзіцца недзе на тэрыторыі абмежаванай Клецкам і вёскамі Салтанаўшчына, Затур'я, Бузуны, Плескавічы, Ракавічы і Круты Бераг Нясвіжскага раёна.

Як ужо адзначалася, археалагічныя матэрыялы XV — пачатку XVI стст. на тэрыторыі сучаснага горада пакуль не прасочваюцца. У гэтай сувязі ўзнікае пытанне, дзе ж размяшчаўся „двор Нясвіж" сярэдзіны XV — пачатку XVI стст. а, магчыма, і больш ранняга часу.

У гэтай сувязі ў цікавым для нас рэгіёне прыцягвае ўвагу гарадзішча, размешчанае паміж сучаснымі вёскамі Качановічы і Слаўкава Ланьскага сельсавета Нясвіжскага раёна, размешчанага прыкладна ў 4-5 км на ўсход ад сучаснага горада.

Гарадзішча, вядомае сярод мясцовага насельніцтва пад назвай „Замкавішча" і „Багумілле", мае памеры 64 х 36 м, размешчана на пагорку на ўскрайку асушанага балота. На гарадзішчы яшчэ у 1953 г. правёў археалагічныя даследаванні Аляксей Мітрафанаў, у выніку якіх было высветлена, што культурны слой помніка, хаця і пашкоджаны больш познімі пахаваннямі, але ў ім прасочваюцца два стратыграфічныя і хinduced храналагічныя слаі, якія адлюстроўваюць розныя этапы функцыянавання помніка.

У ніжніх напластаваннях культурнага слоя ёсць матэрыялы культуры штрыхаванай керамікі (I-V стст. н.э.): знойдзены кераміка, гліняныя праселкі і грузікі, шпількі і іншыя рэчы, якія адносяцца да гэтай культуры[17].

У верхніх напластаваннях гарадзішча сустракаюцца матэрыялы XI — пачатку XVI стст., аднак большасць іх адносіцца да XII-XV стст. Сярэднявечныя матэрыялы прадстаўлены знаходкамі жалезных клю-

[16] J. Jakubowski, *Czy istnieli kniaziowie nieświescy?..*, s. 8.

[17] А. Г. Митрофанов, *Дневник экспедиций за 1951-1953 гг.*, Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, адз. зах. 12, арк. 82-83; А. Г. Митрофанов, *Железный век средней Белоруссии (VII-VI вв. до н.э. — VIII в. н.э.)*, Мінск 1978.

чоў, нажоў, чатырохграннага наканечніка стралы[18], фрагментам амфары і гаршкоў.

Побач з гарадзішчам знаходзіцца селішча памерамі каля 4 га. Шурфоўка, праведзеная Валерым Пазняковым, выявіла тут матэрыялы XI-XVI стст., аднак большая частка матэрыялаў, як і на гарадзішчы, адносіцца да XII-XV стст.[19] Акрамя таго, раней каля гарадзішча адзначалася і наяўнасць курганнага могільніка X-XIII стст.[20]

Наяўнасць буйнога сярэдневяковага археалагічнага комплексу з матэрыяламі XI — пачатку XVI стст. у наваколлях горада другой паловы XVI-XVIII стст. дазваляе сцвярджаць, што менавіта гэты комплекс на працягу доўгага часу выконваў ролю цэнтра сельскагаспадарчай акругі і што менавіта тут знаходзіўся той „двор Нясвіж", які згадваюць крыніцы сярэдзіны XV — першай паловы XVI стст.

Існаванне паселішча на гарадзішчы „Замчышча" на працягу XI — пачатку XVI стст. і ўлічваючы, што гэта адзінае ўмацаванае паселішча на значным абшары, сведчыць пра выконванне ім функцыі цэнтра воласці на працягу гэтых стагоддзяў і пра тое, што сярэднявечны Нясвіж узнік значна раней таго часу чым ён трапляе на старонкі пісьмовых крыніц. Верагодна, першапачаткова гэта быў цэнтр невялікай воласці ў складзе Клецкага ўдзельнага княства XII — сярэдзіны XIII стст., а з другой паловы XIII-XIV стст., пасля ўваходу гэтых зямель у склад ВКЛ, цэнтрам гаспадарскай воласці.

Археалагічныя помнікі X-XIII стст. (курганныя могільнікі, паселішчы, гарадзішчы), якія, магчыма, маркіруюць памеры воласці Нясвіжа вядомы каля вёсак Чанавічы, Сейлавічы, Грыцкавічы, Качановічы, Гусакі, Наруцавічы, Нялепава, Хадатовічы, Вялікая Быхаўшчына, Міцькавічы, Матылеўшчына.

На карысць лакалізацыі „двара Нясвіж" на гарадзішчы, размешчанага паміж вёскамі Качановічы і Слаўкава, сведчыць як назва гарадзішча — „Замкавішча", так і аналіз яго месцаразмяшчэння ў сувязі з магчымым паходжаннем назвы Нясвіжа.

Па-першае, назва гарадзішча „Замкавішча" магла ўзнікнуць толькі ў эпоху сярэднявечча і адлюстроўвала наяўнасць на ім феадальнага замка. Альбо назва гарадзішча ўзнікла некалькі пазней, але ў той час, калі памяць пра існаваўшы калісьці на ім замак яшчэ была жывая.

[18] В. С. Пазднякоў, *Археалагічнае вывучэнне Нясвіжчыны*, [у:] *Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Нясвіжскага раёна*, Мінск 2001, с. 22-24.

[19] В. С. Пазднякоў, *Справаздача аб палявых даследаваннях у Пінску і Нясвіжскім раёне ў 1992 г.*, Архіў Інстытуга гісторыі НАН Беларусі, адз. зах. 1441, арк. 3-7; В. С. Пазднякоў, *Археалагічнае вывучэнне Нясвіжчыны...*, с. 22-24.

[20] Г. В. Штыхов, *Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма*, вып. 2, Мінск 1971, с. 197.

Па-другое, існуючыя шматлікія паданні пра паходжанне назвы сучаснага горада, сабраныя мясцовай краязнаўцай Клаўдзіяй Шышыгінай-Патоцкай і іншымі даследчыкамі, даволі цікавыя і лірычныя[21], аднак не маюць пад сабой ніякай гістарычнай падставы.

Так, Вадзім Жучкевіч і Аляксандр Рогалеў даволі сугучна тлумачаць паходжанне назвы Нясвіж. На іх думку першая частка назвы горада гэта адмаўленне ў выглядзе часціцы „не". А другую частку назвы горада В. Жучкевіч выводзіць са слова „свідь", „свідзіна" — зараслі, кустарнік каля ракі. Адсюль ён і тлумачыць назву Нясвіжа — як месца каля вады, дзе няма прыбярэжных зарасляў. На думку А. Рогалева, другая частка слова мае паходжанне ад слова „свідаўка" — балоцістая рэчка, альбо рэчка, якая працякае праз балота. Таму ён лічыў што паселішча ўзнікла на волаку з ракі Лань у раку Уша і тлумачыць назву „Несвіж" як паселішча не на балоцістым месцы.

Аднак гэтыя даволі штучныя гіпотэзы не маюць пад сабой ніякага гістарычнага тлумачэння. Адносна волаку з Ушы на Лань, то па-першае ён не маркіруецца ніякімі археалагічнымі помнікамі. А па-другое, волак калі і існаваў, то ён павінен быў знаходзіцца недзе ў раёне сучаснага ляснога масіву „Альба" — у тым месцы, дзе адлегласць паміж рэкамі Лань і Уша найменшая.

Шукаючы паходжанне назвы Нясвіжа выключна ў славянскіх мовах, даследчыкі не звярталі ўвагі на той факт, што славяне з'явіліся ў вярхоўях Нёмана адносна позна — не раней другой паловы I тыс. н.э., а да гэтага абарыгенным насельніцтвам рэгіёна былі балцкія плямёны.

Назва горада — Нясвіж, паказвае сваю блізкасць да некаторых слоў у літоўскай мове балцкай моўнай групы. Бліжэйшыя аналогіі ёй мы сустракаем у словах „nešvarús", „nešvaruinas", што адзначае „бруд", „брудны", „нячысты", „нечыстота".

Гэта наводзіць на думку пра тое, што першапачатковае паселішча з назвай „Нясвіж" узнікла яшчэ ў тыя часы, калі яго наваколлі засялялі балцкія плямёны і першапачатковае ядро будучага горада XVI-XVIII стст. трэба шукаць у месцы па сённяшніх мерках не зусім прыдатным для паселішча — недзе каля балота, у забалочаным, брудным месцы.

Усё гэта зноў схіляе наш позірк на гарадзішча паміж сучаснымі вёскамі Качановічы і Слаўкава. Першапачатковае засяленне помніка балцкімі плямёнамі, яго размяшчэнне на ўскрайку балота ў адноснай блізкасці ад сучаснага Нясвіжа дазваляе зноў выказаць меркаванне, што менавіта ад-

[21] К. Я. Шишигина-Потоцкая, *Легенды Несвижа. Историко-краеведческий очерк*, Барановичи 2001, с. 3-4; В. А. Жучкевич, *Краткий топонимический словарь Белоруссии*, Мінск 1974, с. 257; А. Ф. Рогалеў, *Нясвіж*, „Мінская праўда", 27 ліпеня, 2000 г.

сюль пачаў сваё развіццё Нясвіж, першапачатковая назва якога магла абазначаць „паселішча каля балота”, ці нешта блізкае да гэтага.

Нельга выключыць, што адсюль вядзе сваю гісторыю і паданне пра паходжанне назвы „Нясвіж” ад быццам бы забітага ліцвінскім князем мядзведзя. Адразу яго забраць не змаглі, а калі прыехалі за ім у другі раз, то ён ужо пратух — мядзведь быў нясвежы, адсюль і назва горада Нясвіж[22]. Хутчэй за ўсё ў гэтым паданні захавалася памяць пра цяжкі пах каля Нясвіжа на балоце, якое з часам набыло прыгажосць, а рэальная сітуацыя проста сцёрлася з памяці людзей.

Археалагічныя крыніцы дазваляюць рэканструяваць раннюю гісторыю паселішча паміж вёскамі Качановічы і Слаўкава. Пакінутае балцкім насельніцтвам у V ст. н.э. гарадзішча эпохі жалезнага часу захоўвала сярод мясцовага насельніцтва сваю назву — „Нясвіж”, і калі на мяжы I і II тыс. н.э. тут з’явіўся новы славянскі элемент і заняў яго, то прышлае насельніцтва захавала былую балцкую назву паселішча і такім чынам назва „Нясвіж” дайшла да нас.

Сярэдневяковае паселішча „двор Несвиж” існавала на гарадзішчы паміж вёскамі Качановічы і Слаўкага з XI да мяжы XV-XVI стст., а потым было перанесена ў раён сучаснага горада. Таму двор Нясвіж, якім валодалі Солтаны, размяшчаўся яшчэ на гэтым гарадзішчы.

Пётр Янавіч Мантыгірдавіч, які атрымаў Нясвіж 10 лістапада 1492 г. ад вялікага князя Аляксандра, загінуў у 1494 г., не пакінуўшы па сябе нашчадкаў па мужчынскай лініі. Яго вялікія ўладанні былі падзелены паміж ягонай дачкой Ганнай і ўдавой. Нясвіж адышоў да ўладанняў Ганны, якая была ў шлюбе з полацкім ваяводам Станіславам Кішкам і такім чынам Нясвіж апынуўся сярод уладанняў Кішкаў. Другая частка ўладанняў нябожчыка, разам з Алыкай, засталася ва ўладаннях удавы Пятра Янавіча[23].

На пачатку другога дзесяцігоддзя XVI ст. у Нясвіжы з’яўляюцца новыя гаспадары — княжацкі род Радзівілаў, якія з часам зрабілі яго цэнтрам сваіх уладанняў. Нясвіж дастаўся Радзівілам „па кудзелі”.

У 1513 г. князь Ян Радзівіл Барадаты бярэ шлюб з Ганнай, дачкой Станіслава Кішкі і Ганны з Мантыгірдаў і, такім чынам, Нясвіж упершыню трапляе ў сферу інтарэсаў Радзівілаў і гэтую дату (1513 г.) Радзівілы лічаць пачаткам свайго валодання Нясвіжам.

Аднак першапачаткова Нясвіж заставаўся ў сумесных уладаннях Кішкаў і Радзівілаў і з боку Кішкаў у ім гаспадарыў сын Станіслава Янавіча, Пётр. Пра гэта сведчыць крыніца ад 30 ліпеня 1516 г., у якой кароль разглядаў скаргу князёў Пятра і Яна Дзержковічаў на Пятра Станісла-

[22] К. Я. Шишигина-Потоцкая, *Легенды Несвижа...*, с. 3.
[23] J. Jakubowski, *Czy istnieli kniaziowie nieświescy?..*, s. 4.

вавіча, які хаваў у сваім маёнтку Нясвіж збеглых ад братоў 18 падданых. Кароль запатрабаваў, каб апошні на працягу двух тыдняў вярнуў іх былым гаспадарам[24]. Нясвіж заставаўся ў руках Кішкаў і пазней. Ён цалкам перайшоў ва ўладанні Радзівілаў толькі на пачатку 20-х гадоў XVI ст., але і то на кароткі час.

У 1522 г. памірае Ганна з Мантыгірдаў Кішка. Яе спадчына была падзелена паміж сынам Пятром Станіслававічам — ваяводам троцкім і дачкой — Ганнай Радзівіл, паміж якімі доўга ішлі спрэчкі з-за спадчыны.

Нарэшце ў 1523 г. было заключана пагадненне аб урэгуляванні спрэчак, у выніку якога Пётр Станіслававіч Кішка атрымаў воласць Іўе, а Ганна Радзівіл — Нясвіж з Шацкай воласцю. Воласць Лахву яны падзялілі[25].

Крыніца, якая паведамляе пра гэты падзел, цікавая тым, што дае нам не толькі дату, калі Нясвіж цалкам перайшоў ва ўладанні Радзівілаў, але і дае нейкае ўяўленне пра памеры воласці Нясвіжа першай паловы XVI ст. Той факт, што за сярэднюю па памерах воласць Іўе давалі Нясвіж з Шацкай воласцю сведчыць пра тое, што сама воласць Нясвіжа і сам Нясвіж у гэты час былі вельмі малымі.

Аднак у гэтым жа 1523 г. памірае Ян Радзівіл Барадаты, а яго ўдава Ганна бярэ шлюб са Станіславам Кішкам, у якім нарадзіла сына Войцеха і дачку Ганну. Калі ў 1528 г. памірае Ганна Кішчанка, то дзяцей ад першага шлюбу з Янам Радзівілам — братоў Мікалая і Яна — узяў пад апеку віленскі кашталян Юры Мікалай Радзівіл, а дзяцей ад другога шлюбу — Забярэзінскія.

В 1533 г. маладыя Ян і Мікалай Радзівілы выйшлі з-пад апекі і распачалі спрэчку з Забярэзінскімі з-за спадчыны, у выніку якой атрымалі ад апошніх усе спадчынныя ўладанні маці з умовай, што калі нашчадкі па лініі Кішкаў дасягнуць паўналецця, Радзівілы падзеляцца з імі. Аднак дзяліцца Мікалаю і Яну Радзівілам не давялося. Войцех і Ганна памерлі ў дзяцінстве і ўсе спадчынныя ўладанні Ганны Кішчанкі, у тым ліку і Нясвіж, перайшлі братам Мікалаю і Яну Радзівілам. Фактычна толькі з гэтага года (1533 г.) Радзівілы сталі паўнавартаснымі гаспадарамі Нясвіжа.

Крыніцы не данеслі да нас калі „двор Нясвіж” быў перанесены з гарадзішча „Замкавішча” паміж вёскі Качановічы і Слаўкава і дзе менавіта ўзнік новы ўмацаваны цэнтр Нясвіжа. Аднак некаторыя ўскосныя даныя дазваляюць сцвярджаць, што перанясенне Нясвіжа на новае месца адбылося на пачатку XVI ст. Да такой высновы падводзіць самая першая судовая справа маладых Яна і Мікалая Радзівілаў, што разглядалася ў 1533-1534 гг.

[24] *РИБ*, т. 20, стб. 1195-1196.
[25] Там жа, стб. 871-876.

У кастрычніку 1533 г. Аляксандр Солтанавіч распачаў судовую справу супраць Яна і Мікалая Радзівілаў „о церковь в Несвиже". Браты вымушаны былі звярнуцца да караля з просьбай аб пераносе разгляду справы на той падставе, што яны толькі выйшлі з-пад апекі, яшчэ не былі ва ўсіх сваіх маёнтках, не ўвайшлі ў курс справы і нічога канкрэтнага не могуць адказаць на выказаныя прэтэнзіі. Кароль пайшоў насустрач маладым уладальнікам Нясвіжа і адклаў разгляд справы да дня святой Барбары — за тры тыдні да Раства[26].

Гэтае паведамленне цікавае тым, што гаворыць пра тое, што да пачатку кастрычніка 1533 г. маладыя Мікалай і Ян Радзівілы яшчэ ніколі не былі ў Нясвіжы і не мелі ніякага ўяўлення пра яго.

Да снежня браты, верагодна, ужо пабывалі ў Нясвіжы і справа была прынята да разгляду. На гэты раз з узбуджанай справы мы даведваемся, што спрэчка Аляксандра Солтанавіча з Радзівіламі мае даволі доўгую гісторыю і першы, пры з'яўленні новых уладальнікаў Нясвіжа, толькі аднавіў сваю барацьбу.

Спрэчка цягнулася з часоў Ганны Кішчанкі з-за нейкага гарадзішча, на якім стаяла царква. Аляксандр Солтанавіч абгрунтоўваў свае правы на гарадзішча тым, што ён купіў яго ў баярына Ганны Кішчанкі, у той час як апошняя сцвярджала, што „маёмасць Нясвіж" — гарадзішча пад назвай Нясвіж — з'яўляецца яе спадчынай ад маці. У свой час гэтая спрэчка ўжо разглядалася ў судзе і, пры дапамозе каралевы Боны (не раней за 1523-1528 гг.) справа была вырашана на карысць Ганны Кішчанкі. Аднак пасля смерці апошняй і дасягнення паўналецця яе сыноў Аляксандр Солтанавіч зноў узняў пытанне.

Кароль Сігізмунд да канчатковага высвятлення пытання пра прыналежнасць гарадзішча і царквы, што стаяла на ім, перадаў апошнюю ў рукі кіеўскага мітрапаліта Іосіфа, а для аб'ектыўнага вырашэння справы былі прызначаны камісары з абодвух бакоў[27].

Апошняя крыніца, што адносіцца да гэтай справы, датуецца сакавіком 1534 г. Згодна з ёю камісары павінны былі разабрацца з гэтым пытаннем і наступны раз справу павінны былі разглядаць на пятым тыдні па Вялікадню, у чацвер[28]. Крыніцы пра канчатковы разгляд гэтай справы не захаваліся, але, мяркуючы па тым, што Нясвіж застаўся ў руках Радзівілаў, Аляксандр Солтанавіч і гэты раз справу прайграў.

Аднак для нас у гэтай справе больш істотным з'яўляецца другі факт. Сцвярджэнне, што маетнасць Нясвіж на пачатку XVI ст. размяшчалася на гарадзішчы і што гэтае гарадзішча нейкі перыяд знаходзілася ва ўла-

[26] *Литовская метрика. Книга судных дел № 8*, Вильнюс 1999, с. 49.
[27] Там жа, с. 95-96.
[28] Там жа, с. 110.

данні служылага баярына Кішкаў, які нават пасмеў прадаць яго Аляксандру Солтанавічу.

Гэта падводзіць да думкі пра тое, што не раней за 1494 г., калі Нясвіж апынуўся ў руках Кішкаў, і не пазней за 1523 г., калі Ганна Кішчанка стала гаспадыняй усяго Нясвіжа і пачала барацьбу за сваю спадчыну, увага да гарадзішча былога двара „Нясвіж" была зніжана і само яно не прыцягвала ўвагі Кішкаў і Радзівілаў.

На наш погляд, такія адносіны да Нясвіжа, размешчанага на нейкім гарадзішчы, маглі адбыцца толькі з той нагоды, што сам цэнтр воласці ў гэты момант (паміж 1494 і 1523 гг.) быў перамешчаны з гарадзішча паміж вёскамі Качановічы і Слаўкава на новае месца. Гэтаму не пярэчаць і матэрыялы з самога гарадзішча, якія сведчаць, што жыццё на ім спынілася на мяжы XV-XVI стст.

Галоўнай прычынай пераносу цэнтра Нясвіжскай воласці на новае месца была малая плошча гарадзішча „Замкавішча", якая не давала магчымасці павялічыць умацаваны цэнтр воласці. У пошуках новага месца для цэнтра воласці позірк Кішкаў упаў на мыс, утвораны правым берагам ракі Уша і балоцістай нізінай, некалькі ніжэй месцаразмяшчэння былога „двара Нясвіж", на якім можна было пабудаваць значна большае па памерах умацаванне і які з трох бакоў меў надзейныя натуральныя ўмацаванні.

У гэтай сувязі прыцягвае ўвагу план Нясвіжа 1796 г., на якім на поўнач ад мураванага замка Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі паказана ўзвышша, якое згодна з эксплікацыяй плана на той час было занята стайняй і карэтным дваром Радзівілаў. Мяркуючы па плане, узвышша мела памеры каля 200 х 100 м і размяшчалася на пачатку мыса ўтворанага Дзікім ставам і балоцістай нізінай, што размяшчалася на паўночны захад ад замка. Гэтае ўзвышша, абмежаванае балотам і поймай ракі Уша, было добра ўмацавана з трох бакоў і само запірала мыс, на якім, з часам, быў пабудаваны замак Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі.

Нельга выключыць, што менавіта сюды быў перанесены з гарадзішча „Замкавішча" „двор Нясвіж" і тут Нясвіж прадоўжыў сваё развіццё. Верагодна, гэта быў драўляны замак які функцыянаваў да канца 40-х гадоў XVI ст.

На жаль, да нашых часоў гэтае гарадзішча не захавалася. Верагодна, яно было зрыта не пазней за апошнюю трэць XIX ст. Пра такую дату знішчэння помніка сведчыць той факт, што помнік яшчэ паказаны на плане горада 1796 г., а ў 1876 г. на гэтай прасторы закладваецца сучасны Стары парк, што сведчыць пра тое, што гарадзішча ўжо не было.

Старое гарадзішча Нясвіжа не прасочваецца ўжо і на плане горада 1810 г. Таму нельга выключыць, што яно, як і фартыфікацыйныя збудаванні горада, было зрыта пры князю Даменіку Радзівіле. За той невя-

лікі час, якім ён валодаў горадам, князь Дамінік разгарнуў вялікую працу па ўпарадкаванню свайго радавога гнязда. Таму нельга выключыць, што яшчэ ён планаваў пашырыць існаваўшы ў сярэдзіне XVIII ст. каля замка парк „Кансаляцыя" і для гэтага зрыў старое гарадзішча. Пра вялікія нівеліровачныя працы, што праводзіліся на тэрыторыі Старога парку, сведчаць і праведзеныя тут археалагічныя даследаванні: першапачатковы дзірван залягае пад праплásткай суглінку магутнасцю 0,3-0,4 м, на якой залягаў сучасны дзірван.

Падчас абрання Кішкамі новага месца для цэнтра воласці не апошнюю ролю адыграў і эканамічны фактар. Калі раней „двор Нясвіж" на гарадзішчы паміж вёскамі Качановічы і Слаўкава кантраляваў толькі дарогу на Копыль, то для новага цэнтра воласці быў абраны бераг ракі Уша ў месцы перакрыжавання шляхоў з Мінска на Клецк і з Вільні на Слуцк.

Пасля таго як Нясвіж ад Кішкаў канчаткова перайшоў у рукі Радзівілаў, менавіта на месцы старога замка братамі Мікалаем і Янам Радзівіламі быў пабудаваны новы замак, які часткова прасочваецца ў ніжнім левым кутку гравюры Томаша Макоўскага з выявай Нясвіжа над назвай „Domus capitanei".

Калі пабудавалі „Domus capitanei" — невядома. Можна толькі выказаць меркаванне, што гэта адбылося ў сярэдзіне XVI ст., пасля 1547 г., калі браты Мікалай і Ян Радзівілы атрымалі ад імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі тытул князёў „на Олыке і Нясвіже" і з гэтага часу Нясвіж становіцца адной з тытулярных рэзідэнцый гэтага княжацкага роду. Адпаведна і рэзідэнцыя князёў Свяшчэннай Рымскай імперыі павінна была мець прыстойны для ўладальнікаў высокага тытула выгляд.

Мяркуючы па фрагменце замка, які прасочваецца на гравюры, ён быў прамакутнай формы з шасціграннымі, як мінімум, трохпавярховымі вежамі на кутах. Ва ўсялякім выпадку, на гравюры выразна прасочваюцца два ўзроўні байніц, што ўзвышаюцца над замкавымі сценамі.

Па сваёй планавай кампазіцыі гэта, верагодна, быў тыповы замак-кастэль, характэрны для Заходняй Еўропы канца XV — першай паловы XVI стст. і мае бліжэйшую планавую аналогію з Мірскім замкам. Хутчэй за ўсё, замак меў пяць вежаў: чатыры вежы па кутах і цэнтральную, уязную. Апошняя знаходзілася на той частцы замка, што не трапіла на гравюру. Ва ўсялякім выпадку, менавіта сюды вядзе дарога з мураванага замка Мікалая Радзівіла Сіроткі, якая паказана на гравюры ў выглядзе хвалістай стужкі.

На гравюры добра прасочваюцца і іншыя будынкі замка. Так, паралельна паўднёва-заходняй (задняй) сцяне замка стаяў вялікі будынак з двума рызалітамі, якія былі павернуты ва ўнутраную частку замка. Мяркуючы па прапорцыях, гэты будынак, як і вежы замка, быў трохпавярховым. Паміж рызалітамі, верагодна, знаходзіўся ўваход у буды-

нак, аформлены ў выглядзе аднаскатнага крытага ганка. Мяркуючы па афармленню франтонаў, будынак мог быць цагляным. Хаця нельга выключыць, што Т. Макоўскі, выхаваны на мураванай архітэктуры сталіцы Польскай кароны, проста так намаляваў гэты будынак, а на самой справе ён быў драўляным. Улічваючы, што гэта самы вялікі будынак у замку, хутчэй за ўсё, гэта быў княжацкі палац. Ды і размяшчэнне будынка ў глыбіні замка, у баку ад уязной брамы, таксама з'яўляецца характэрнай рысай размяшчэння княжацкай рэзідэнцыі.

Бліжэй да цэнтра замка, перпендыкулярна будынку палаца, размяшчаўся другі вялікі будынак. На гравюры ён паказаны з закругленым франтонам, што дазваляе, на наш погляд, разглядаць яго як пабудаваную ў стылі гатычнай базілікі пабудову. На карысць гэтага сведчыць і крыж, які прасочваецца на процілеглым фасадзе гэтага будынка. Нельга выключыць, што гэта замкавы касцёл, альбо — улічваючы рэлігійныя погляды Мікалая Радзівіла Чорнага і яго брата Яна — больш позні рэфарматарскі храм.

Каля паўднёва-ўсходняй сцяны замка паказаны яшчэ адзін вялікі шматпавярховы будынак, а каля паўночна-заходняй сцяны — невялікі аднапавярховы будынак. Каля паўночна-заходняй сцяны стаяў яшчэ адзін, значна большы па памерах будынак. Цэнтр замка быў засаджаны дрэвамі — магчыма тут знаходзіўся невялікі замкавы парк, што ў цэлым было даволі распаўсюджанай з'явай у замках Заходняй Еўропы.

Інвентары гэтага замка да нас не дайшлі. Аднак роля нясвіжскага замка як вялікага ваеннага цэнтра ВКЛ сярэдзіны XVI ст. пацвярджаецца вялікім спісам зброі, якая была вывезена адсюль у 1569 г. у Чарнаўчыцы пад Берасцем.

Як доўга функцыянаваў гэты замак дакладна невядома. Ён яшчэ існаваў у час, калі Т. Макоўскі рабіў гравюру з выявай Нясвіжа (1600 г.), а пасля завяршэння будаўніцтва ў канцы XVI — пачатку XVII стст. новага мураванага замка Мікалаем Крыштафам Радзівілам Сіроткай, яго пабудовы, верагодна, прыйшлі ў заняпад і былі разабранымі. Ва ўсялякім выпадку ў інвентары Нясвіжскага княства і замка 1626-1628 гг. „Domus capitanei" ўжо не згадваецца[29].

Верагодна, пад прыкрыццём замка развівалася паселішча, на якім жыла яго абслуга. Пра гэта сведчыць праслойка культурнага слоя магутнасцю да 20 см, якая была зафіксавана падчас археалагічных і геалагічных даследаванняў фартыфікацыйных збудаванняў мураванага замка Мікалая Радзівіла Сіроткі. Падобная карціна назіралася як пры даследаванні вала з боку Замкавага става, так і пры даследаванні ўсходняга бастыёна замка, дзе пад гліняным каркасам вала магутнасцю да

[29] T. Bernatowicz, *Miles Christianus et peregrinus. Fundacje Mikołaja Radziwiłła „Sierotki" w ordynacji nieświeskiej*, Warszawa 1998, s. 23.

1 м залягае культурны слой магутнасцю 20-30 см. На жаль, ніякіх датуючых знаходак у гэтым слоі не было знойдзена; яны былі прадстаўлены выключна дробнымі фрагментамі сценак ганчарнай керамікі.

Улічваючы тэрыторыю, якая была паміж замкам Мікалая Чорнага і мысам пры ўпадзенні ручая ў раку Уша, плошча паселішча была не болей за 3-4 га. Паселішча было добра ўмацавана ракой Уша і дрыгвянай нізінай з усходняга, паўднёвага і заходняга бакоў, а з поўначы яго надзейна абараняў замак. У апошняй трэці XVI ст. гэтае паселішча, верагодна, было перанесена на месца сучаснага горада, а на яго месцы Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка пабудаваў новы замак.

Адначасова з-за таго, што месца для развіцця паселішча пад сценамі замка было недастаткова, пачала засяляцца тэрыторыя ніжэй замка на правым беразе ракі Уша ў месцы перакрыжавання шляхоў з Мінска на Клецк і са Слуцка на Навагрудак. Пра апошняе сведчаць існуючыя ў Нясвіжы перыяду Радзівіла Сіроткі Слуцкая, Віленская, Мінская і Клецкая брамы. А размяшчэнне горада на буйным шляху давала дадатковы штуршок для яго развіцця. Таму найбольш раннія слаі на тэрыторыі сучаснага Нясвіжа, верагодна, трэба шукаць у раёне Слуцкай брамы і прылягаючых да яе вуліц. Нельга выключыць, што да закладкі горада на гэтым месцы магла існаваць і нейкая вёска. Аднак для высвятлення гэтага пытання неабходна правесці дадатковыя археалагічныя даследаванні на шырокай плошчы.

Што з сябе ўяўляў Нясвіж сярэдзіны XVI ст. — невядома. Захаваліся толькі сціплыя звесткі, што ў горадзе існаваў касцёл Святога Духа, які быў пабудаваны яшчэ пры Кішках[30]. А ў 1582 г., згодна з паведамленнямі Пятра Скаргі, у ім налічвалася 230 дымаў, у якіх пражывала каля 3000 жыхароў[31].

Пасля вяртання князя М. К. Радзівіла Сіроткі з пілігрымкі ў Святую Зямлю пачынаецца новы перыяд у гісторыі Нясвіжа, калі ён цалкам перабудоўваецца па еўрапейскіх горадабудаўнічых правілах з квартальнай планіроўкай, з магутнымі фартыфікацыйнымі збудаваннямі. А на левым беразе ракі Уша закладваецца яго новы раён — Новае Месца. Менавіта ў такім выглядзе Нясвіж з'яўляецца перад намі на гравюры Т. Макоўскага.

Такім чынам у развіцці Нясвіжа выразна прасочваецца дынаміка, характэрная для шматлікіх гарадскіх паселішчаў Панямоння, калі яны, пры стварэнні спрыяльных умоў, вырасталі са звычайнага феадальнага двара[32]. У далейшым асновай развіцця горада паслужылі перанос

[30] R. Seges, *Nieśwież. Historia i zabytki*, Warszawa 1991, s. 4.

[31] J. Sygański, *Działalność ks. Piotra Skargi T. J. na tle jego listów 1566-1610*, Kraków 1912, s. 44.

[32] В. У. Шаблюк, *Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння XIV-XVIII стст.*, Мінск 1996, с. 20.

яго на новае месца, метанакіраваная дзейнасць уладальнікаў горада і знаходжанне яго на гандлёвых шляхах, што таксама з’яўляецца характэрнай рысай для развіцця гарадоў ВКЛ у XV-XVIII стст.[33]


**Streszczenie**

Artykuł traktuje o założeniu i początkowym okresie kształtowania się Nieświeża, przyszłego centrum administracyjnego włości magnackiego rodu Radziwiłłów. W XII-XV ww. Nieśwież rozlokował się na grodzisku i przylegających doń osadach warownych pomiędzy współczesnymi wsiami Kaczanowicze i Sławkowo w rejonie nieświeskim, leżącymi w odległości 5-6 km od współczesnego miasta. W tym okresie Nieśwież był „dworem”, centrum administracyjnym niewielkich włości.

Na przełomie XV i XVI w. z powodu małej powierzchni starożytnego grodu centrum administracyjne włości zostało przeniesione w okolice współczesnego miasta, gdzie na miejscu współczesnego Starego Parku został wzniesiony drewniany zamek, obok którego rozpoczął rozwijać się ośrodek miejski.

Radziwiłłowie pełnoprawnymi gospodarzami Nieświeża zostali dopiero w 1533 r. i z aktywnością tego rodu związany jest dalszy rozwój miasta. W czasach księcia Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła „Sierotki” miasto zostało przebudowane zgodnie z zasadami europejskiej sztuki urbanistycznej, a układ przestrzenny Nieświeża ukształtowany w końcu XVI w. zachował się do dnia dzisiejszego.



**Summary**

The article describes the foundation and initial period of Nieśwież development — a future administrative centre of the estate owned by the Radziwiłł magnate family. In the 12th — 15th centuries Nieśwież was located within the *grodzisko* area and the surrounding fortified settlements between the then villages Kaczanowicze and Sławkowo in Nieśwież region, situated 5-6 km away from the contemporary town. At that time Nieśwież was a „manor house”, an administrative centre of a small estate.

At the turn of the 15th and 16th centuries, due to a small area of the ancient town, the estate’s administrative centre was moved into the vicinity of the contemporary town where a wooden castle was erected in the place of the contemporary Old Park, next to which a town centre started to develop.

The Radziwiłł family became rightful landlords of Nieśwież as late as 1533 and further development of the town is connected with their activity. During the time of Duke Mikołaj Krzysztof Radziwiłł „The Orphan” the town was rebuilt according to the rules of European urban art whereas the spatial arrangement of Nieśwież developed at the end of the 16th century has been retained until now.



**Andrej Miacielski** — starszy pracownik naukowy Wydziału Historii Białorusi Wieków Średnich i Początku Czasów Nowożytnych Instytutu Historii Narodowej Akademii Nauk Białorusi w Mińsku.


[33] Г. Я. Мокеев, *Черты своеобразия в структуре городов восточных и западных славян*, „Архитектурное наследство”, 1975, № 23, с. 8.